# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:**

**Па гарызанталі:** Есаул. Гну. Ноч. Ляск. Уладар. Ліга. Шкло. Балота. Нанду. Люстра. Дзэка. Бра. Вупраж. Кума. Рамо. Двор. Гусар. Рада. Тара.

**Па вертыкалі:** Скунс. Ланцуг. Качка. Гуляш. Клоўн. Лапа. Дзэпо. Рота. Конь. Булава. Лес. Тур. Тэраса. Абжора. Абед. Дакор. Прут. Амар. Ура.

**Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,** *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.00 | 19.33 | 12.33 |
| Віцебск — | 6.48 | 19.23 | 12.35 |
| Магілёў — | 6.50 | 19.23 | 12.33 |
| Гомель — | 6.47 | 19.19 | 12.32 |
| Гродна — | 7.15 | 19.48 | 12.33 |
| Брэст — | 7.16 | 19.47 | 12.31 |

## Месяц

*Маладзік 28 сакавіка.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Епіфана, Івана, Рыгора, Сямёна, Уладзіміра, Феафана.*
*К. БЛАГАВЕШЧАННЕ ДЗЕВЫ МАРЫІ. Марыі, Пракопа.*



Фота Надзеі БУЖАН.

# ЗАЎТРА




**Заядлага рыбака, пчалавода і садавода, адданага падпісчыка «Звязды», нашага любімага татачку і дзядулю Сцяпана Сцяпанавіча ДАРГЕЛЯ шчыра віншуем з прыгожай датай — з 75-годдзем!**

*Было ўсяго ў цябе...*
*Й багата,*
*Бо ідуць гады, бягуць гады...*
*Здароўя, сілы табе, тата,*
*Каб быў заўсёды маладым!*
*Каб зоркі падалі ў руку,*
*Заўжды, ва ўсім спрыяла неба*
*І каб хапала ў кашальку*
*Яшчэ і ўнукам на патрэбы!*

Дзякуй, што ты ў нас ёсць!

**Твая сям'я.**



Даты | Падзеі | Людзі

## 25 САКАВІКА

**1717** год — нарадзіўся (маёнтак Дзятлава Навагрудскага ваяводства) Альбрыхт Радзівіл, дзяржаўны дзеяч ВКЛ. З 1755 года — генералмаёр войска ВКЛ. У 1768 г. далучыўся да Барскай канфедэрацыі. У 1771-м распрацаваў план, які прадугледжваў распаўсюджванне канфедэрацыі на ўсёй Беларусі, захоп галоўных замкаў, канцэнтрацыю войск у Бабруйску і наступны марш у Польшчу. Пасля ваенных няўдач выехаў у Сілезію, а затым у Італію. У 1777 годзе вярнуўся і прымірыўся з каралём. Валодаў Глускам і Хальчам у Рэчыцкім павеце. Памёр пасля 1790 года.

**1768** год — нарадзіўся (маёнтак Шчорсы Навагрудскага павета) Адам Храптовіч, палітычны дзеяч, філантроп, мецэнат. Вучыўся ў Галоўнай школе ВКЛ (Віленскі ўніверсітэт), падарожнічаў па Германіі, Даніі, Англіі. Удзельнік паўстання Т. Касцюшкі ў 1794 г. У сваіх уладаннях адмяніў цяглеснае пакаранне для прыгонных сялян, паменшыў ім падаткі. Пры яго маёнтку ў Шчорсах існавала буйная пачатковая школа сумеснага навучання, у якой толькі ў 1822 годзе займаліся 350 вучняў з асяроддзя прыгонных сялян. У вайну 1812 г. указам Напалеона прызначаны членам адміністрацыі Віленскага дэпартамента. У 1834 — 1836 гадах — прэзідэнт Віленскага дабрачыннага таварыства, віцэ-прэзідэнт Віленскага друкарскага таварыства. Актыўна папаўняў старадрукаванымі выданнямі XIX ст. бібліятэку Храптовічаў. Памёр у 1844 годзе.

**1907** год — нарадзіўся (г. Гомель) Зефіраў Аляксей Пятровіч, савецкі хімік-неарганік і металург, член-карэспандэнт АН СССР. У 1932 — 1956 гадах працаваў у Міністэрстве каляровай металургіі СССР, адначасова ў Маскоўскім хіміка-тэхналагічным інстытуце. З 1967 года быў дырэктарам Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута хімічнай тэхналогіі. Аўтар навуковых прац па хіміі і металургіі рэдкіх і высакародных металаў. Лаўрэат Ленінскай прэміі, Дзяржаўнай прэміі СССР. Памёр у 1979 годзе.



**1957** год — Францыя, ФРГ, Італія, Бельгія, Нідэрланды і Люксембург падпісалі так званыя Рымскія дагаворы аб заснаванні Еўрапейскай эканамічнай супольнасці (ЕЭС) і Еўрапейскай супольнасці па атамнай энергіі (Еўратам), якія заклалі падмурак еўрапейскай інтэграцыі і сучаснага Еўрапейскага саюза.

### Было сказана

**Пятрусь МАКАЛЬ, паэт:**

*«Але якія б высі ні ўздымалі,*
*Ізноў вяртацца трэба на зямлю».*

## УСМІХНЕМСЯ

У сям'і дзевяць дзяцей. Маці зварыла бульбу ў мундзірах, паставіла на стол. Малодшы кінуўся есці разам з лупінай. Маці:

— Вовачка, пачысці бульбу...

Малы:

— Пакуль шышціш — ж'яджуць!

**Ён казаў: «Я не магу ажаніцца». Але з маім татам пазнаёміўся і... змог.**

Пацыентка была практычна здаровая, пакуль доктар не даведаўся, што яна — фінансавы дырэктар банка...

**Муж — жонцы:**

**— Я ведаю пра твайго палюбоўніка!**

**— Гэта няпраўда, дарагі! Хлусяць!**

**— Ды маўчы ты! Я даведаўся пра яго бізнес і даходы і хачу спытаць: у цябе ёсць сумленне прасіць у мяне футра?!**

Развяліся праз месяц, таму што іх каты не сышліся характарамі.




Малюнак Вікенція ПУЗАНКЕВІЧА і Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1105.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 24 сакавіка 2017 года.